

магілёўскі
Выбар

№ 11
Ліпень
2012 г.

Абласная Дэмакратычная Трыбуна

ШТО НАПАЛОХАЛА ЛУКАШЭНКУ?



«Нам надо создать в экономическом отношении почти одно государство. Это стратегия. И к этому постараться приспособить наши политические системы. Потому что, может быть, придется еще что-то создавать помимо Евразийской экономической комиссии. Может, у нас и единая оборона будет». Гэта заявіў А.Лукашэнка 22 чэрвеня 2012 года на сустрэчы з маладымі грамадазнаўцамі ў Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

Для тых, хто праследжвае выступленні Лукашэнкі, добра заўважна, што рыторыка яго выказванняў на дадзеную тэму можа рэзка змяняцца на працягу кароткага тэрміну.

Чаму ж ён так тэрмінова змяніў вектар свіх выказванняў у адрозненні ад сказанага крыху раней?

Бо, менавіта, за тыдзень да таго на сустрэчы з прэзідэнтам Башкартастана Рустэмам Хамітавым у Мінску 14 чэрвеня 2012 г., ён зусім па іншаму рэагаваў на выказванні прэм'ер-міністра Расіі Дз.Мядзьведзева і пасла Расійскай Федэрацыі ў Беларусі А.Сурыкава аб неабходнасці тэрміновага ўвядзення расійскага рубля ў якасці адзінай валюты ў маштабе Еўразійскага саюза і правядзення прыватызацыі ў Беларусі.

"Гэта наша прыватызацыя, гэта мы будзем вырашаць, што нам прыватызаваць і калі... па якім кошце і на якіх умовах", — гучыць у яго заяве.

Наконт далейшай інтэграцыі Беларусі з Расіяй ён выказваўся ў яшчэ больш катэгарычнай форме; што яна будзе адбывацца толькі ў тым выпадку, "...калі мы не будзем наступаць адзін аднаму на горла і патрабаваць пытанняў, якія яшчэ не стаяць у парадку дня". Адназначна, гэта прагучала як адказ на пытанне па тэме аб увядзенні адзінай валюты — расійскага рубля на тэрыторыі нашай краіны.

Што ж так напалохала А.Лукашэнку, што ён вымушаны быў канцэптуальна змяніць сутнасць сваіх выказванняў на тэму інтэграцыі з Расіяй?

А адказ вельмі просты...

Гэта прывіды новай "нафтавай

(Пачатак. Заканч. на стар.2)

МАГІЛЁЎ: ЗАСУДЗІЛІ КАРУПЦЫЯНЭРА З ГАРВЫКАНКАМА



Былы намесьнік старшыні Магілёўскага гарвыканкама прысуджаны да трох гадоў пазбаўленьня волі.

Як паведаміла прэс-група ўпраўленьня КДБ па Магілёўскай вобласьці, супрацоўнікамі УКДБ былі выяўленыя факты выкарыстаньня службовага становішча ў карысьлівых мэтах былым намесьнікам старшыні гарвыканкама.

Чыноўнік, які курыраваў працу будаўнічай галіны горада, вырашыў мінімізаваць выдаткі на будаўніцтва ўласнага дома. За «дапамогай» ён зьвярнуўся да дырэктара будаўнічай арганізацыі з просьбай прадставіць спэцыяльную тэхніку, грузавы аўтатранспарт, будаўнічыя матэрыялы і рабочых будаўнічых спэцыяльнасьцяў без заключэньня адпаведных дамоваў і аплаты.

Нягледзячы на неправамерны характар просьбы службовай асобы, дырэктар прадпрыемства арганізаваў з кастрычніка 2007 года па кастрычнік 2009 года працы па будаўніцтве прыватнага дома. У выніку прадпрыемству быў нанесены ўрон у буйным памеры.

(Заканчэнне на стар. 2)

ШТО НАПАЛОХАЛА ЛУКАШЭНКУ?

(Заканч. Пачатак на стар.1)

вайны” паміж Расіяй і Беларуссю, падобнай на ранейшыя — “газавую”, “малочную”, але па маштабах найбольш адчувальную для эканомікі нашай краіны. Прывіды “нафтавай вайны” аказаліся больш страшнымі, чым жахі частковай страты ўлады пры аб’яднанні ў “амаль адзіную дзяржаву”, якое прадугледжвае і адзіную валюту, і прыватызацыю па правілах Расійскай Федэрацыі...

За студзень-красавік 2012 года экспарт некаторых беларускіх нафтапрадуктаў — растваральнікаў і разбаўляльнікаў, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага году, павялічыўся ў 7,3 разы і склаў 1705,4 млн. долараў. Экспарт змазачных алеяў, вырабленых таксама з расійскай нафты, павялічыўся ажно ў 43 разы ў параўнанні з аналагічным перыядам 2010 года і склаў 590,9 млн. долараў.

Падобны беларускі бізнэс выззваў шэраг пытанняў сярод правячай эліты Расійскай Федэрацыі. Бо расійскі бюджэт губляе значныя сумы з-за непраплочаных вывазных мытаў на беларускія нафтапрадукты.

Раскрыццё афёры ў сферы гандлю нафтапрадуктамі нясе пагрозу існаванню беларускага “разбаўляльна-растваральнага” бізнэса і страту мільярдных прыбыткаў.

Для выхаду са склаўшайся сітуацыі, дзеля захавання прыбытковага бізнэсу, беларускаму боку нічога не застаецца, як пайсці на саступкі ў выглядзе прыватызацыі актываў беларускіх прадпрыемстваў на карысць расійскаму капіталу.

Акрамя гэтага, раскрыццё гандлёвай афёры дазваляе Крэмлю праз пагрозу закрыцця бізнэса атрымаць рэальныя рычагі ўплыву на беларускае кіраўніцтва з мэтай дасягнення таго, каб Беларусь урэшце выканала свае абавязальніцтвы перад Антыкрызісным фондам ЕўрАзЭС аб атрыманні за 2012 год выручкі ў памеры 2,5 млрд. долараў ад прыватызацыі. Бо амаль за паўгода пакуль яшчэ ні адной буйной прыватызацыйнай здзелкі ў Беларусі не праведзена.

Такім чынам, у Крамля адкрываюцца рэальныя перспектывы праз прыватызацыю прапіхнуць у Беларусь расійскі бізнэс і не дапусціць капітал з іншых краін. А гэта дазволіць яму, у сваю чаргу, ў значнай ступені ўплываць на фармаванне коштаў прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў.

А прыватызаваць у Беларусі ёсць што, бо “беларускі пірог” да гэтай пары яшчэ не падзелены. І дзялёжка яго плануецца не на карысць беларусаў.

Толькі, напрыклад, указам № 7 ад 5 студзеня 2012 года, практычна растаптаўшы правы беларускага народу, правы працоўных калектываў, пад выглядам “благавіднага паступка” Лукашэнка адкрыў дарогу расійскаму бізнэсу да прыватызацыі 54 пасляховых беларускіх прадпрыемстваў.

А тое, што на 2013-2014 гады для Беларусі прыпадае пік выплат па знешніх абавязальніцтвах, зноўку грае на карысць Крамля.

Беларусь апынулася перад рэальнай пагрозай, якая вядзе да поўнай страты эканамічнай а надалей і палітычнай незалежнасці ў выніку стварэння адзінай дзяржавы, аб чым выказаўся А.Лукашэнка ў час наведвання Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

Як паказаў час, кіраўніцтва беларускай дзяржавы цалкам і канчаткова засведчыла свой непрафесіяналізм, непатрыятызм, неўменне і нежаданне праводзіць самастойную эканамічную палітыку незалежнай дзяржавы ў інтарэсах яе народу.

Ідэя ўтрымання эканомікі ў выглядзе “прыслугі” беларускай палітычнай мадэлі цалкам правалілася.

У дадзенай сітуацыі здаровым нацыянальна-патрыятычным сілам Беларусі неабходна прыняць тэрміновыя меры па непрызнанню на міжнародным узроўні падобных здзелак па продажу нацыянальнай маёмасці. Незаконныя здзелкі, праведзеныя з парушэннямі беларускага заканадаўства павінны будуць падлягаць перагляду.

Рыгор Кастусёў, намеснік старшыні партыі БНФ


МАГІЛЁЎ: ЗАСУДЗІЛІ КАРУПЦЫЯНЭРА З ГАРВЫКАНКАМА

(Заканч. Пачатак на стар.1)

У адпаведнасьці з ч. 2 арт. 426 «Перавышэньне ўлады або службовых паўнамоцтваў» і ч. 2 арт. 210 «Крадзеж шляхам злоўжываньня службовымі паўнамоцтвамі» Крымінальнага кодэксу Беларусі суд Ленінскага раёна Магілёва вынес быламу чыноўніку пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі тэрмінам на 3 гады з канфіскацыяй маёмасьці і пазбаўленьнем права займаць пасады, зьвязаныя з выкананьнем арганізацыйна-распарадчых абавязкаў. Дырэктару будаўнічай арганізацыі суд вынес аналягічны прысуд з адтэрміноўкай яго выкананьня на 2 гады.

Абвінавачаныя падалі касацыйныя скаргі ў абласны суд, паведамляе прэс-група УКДБ па Магілёўскай вобласьці.

Радыё “Свабода”



МАГІЛЁЎСКІЯ ДЭМАКРАТЫ ЗАКЛІКАЛІ ГРАМАДЗЯН НЕ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ГАЛАСАВАННІ НА ПАРЛАМЕНЦКІХ ВЫБАРАХ



Каардынацыйная рада Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сіл 28 чэрвеня прыняла заяву, у якой выказала меркаванне, што ў Рэспубліцы Беларусь не створаны ўмовы для правядзення свабодных выбараў, таму маючыя адбыцца выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу не могуць лічыцца дэмакратычнымі, празрыстымі і справядлівымі. Таксама сябры Каардынацыйнай рады заклікалі ўсіх грамадзян краіны і ўсіх жыхароў Магілёўскай вобласці, якія маюць права прыняць удзел у выбарах, не ўдзельнічаць у галасаванні і далучацца да дзейнасці дэмакратычных сіл Магілёўшчыны.

Старшыня Каардынацыйнай рады Юрый Новікаў кажа, што прадстаўнікі дэмакратычных арганізацый Магілёўшчыны ўсё ж будуць вылучаць кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў:

“Зараз дэмакратычныя арганізацыі вобласці абмяркоўваюць кандыдатуры тых людзей, якія будуць вылучацца ў якасці кандыдатаў на выбарах. Шэраг кандыдатаў будуць вылучаныя палітычнымі партыямі, некаторыя будуць вылучацца пры дапамозе збору подпісаў выбаршчыкаў. Агульную лічбу пакуль назваць цяжка, бо хтосьці перадумаў ісці на выбары, іншыя, наадварот, вырашылі прыняць удзел у кампаніі толькі зараз. Дакладна вядома адно - кандыдаты ў дэпутаты, якіх падтрымае кааліцыя, будуць агітаваць выбаршчыкаў не ўдзельнічаць у галасаванні. Мы разглядаем удзел у выбарах, у першую чаргу, як удзел у інфармацыйнай кампаніі, праз якую можна данесці да выбаршчыкаў праўду аб сапраўднай сітуацыі ў краіне”, - кажа Юрый Новікаў.

Дэмакратычныя арганізацыіі Магілёўшчыны таксама збіраюцца вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісій. Пакуль дакладна вядома, што партыя і Рух БНФ у Магілёўскай вобласці вылуча ў склад гэтых камісій 10 чалавек, сваіх сяброў плануюць накіраваць і іншыя дэмакратычныя арганізацыі. Усяго ў вобласці створана 13 выбарчых акруг па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу.

Іван Барысаў

ЗАЯВА

КААРДЫНАЦЫЙНАЙ РАДЫ МАГІЛЁЎСКАЙ АБЛАСНОЙ КААЛІЦЫІ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ

Беларускія ўлады аб’явілі аб правядзенні 23 верасня так званых “выбараў” дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. Мы, прадстаўнікі дэмакратычных сіл Магілёўскай вобласці, канстатуем, што беларускімі ўладамі не было выканана ніводнага патрабавання, вылучанага дэмакратычнымі сіламі Беларусі аб умовах правядзення свабодных выбараў. Па-ранейшаму знаходзяцца за кратамі беларускія палітвязні, грамадскія актывісты пазбаўляюцца працы і адлічваюцца з навучальных устаноў за свае перакананні. У выбарчае заканадаўства не ўнесены нават касметычныя змены, захоўваюцца ўсе перадумовы для фальсіфікацыі выбарчага працэсу. Не створаны рэальныя магчымасці для забеспячэння кантролю і вядзення назірання за ходам галасавання і падлікам галасоў. Дзейнасць незалежных сродкаў масавай інфармацыі знаходзіцца пад пільным кантролем з боку выканаўчай улады, пастаяннаму ціску і пераследу падвяргаюцца беларускія праваабаронцы.

Зыходзячы з гэтага і кіруючыся рашэннем Канферэнцыі дэмакратычных сіл Магілёўскай вобласці ад 5 сакавіка 2011 года, Каардынацыйная рада Магілёўскай абласной каліцыі дэмакратычных сіл заяўляе:

(Заканчэнне на стар. 4)

эканоміка

ПЕЧАТНЫЙ СТАНОК НАБИРАЕТ ОБОРОТЫ

Александром Лукашенко в очередной раз поставлена задач правительству повысить тарифную ставку первого разряда. Она должна подняться с 1 августа, второй раз - в октябре. Думается, этот наказ будет исполнен.

Как и будет взят во второй раз заветный рубеж - 500-долларовая зарплата в эквиваленте к концу года (а может быть, и раньше).

Спросите: за счет чего это будет достигаться? Прежде всего за счет задействования административного ресурса. Повысить зарплату бюджетникам достаточно просто: путем очередного повышения ставки первого разряда. А их у нас - треть занятых. Госпредприятия повысят зарплату за счет уменьшения прибыли, фондов накопления и ухудшения других финансовых показателей. Частные у нас погоды не делают, но также в долгу не останутся.

Чтобы помочь им всем в этом деле, Нацбанк и дальше намерен снижать ставку рефинансирования, удешевляя кредиты и белорусский рубль. Наконец, разогреют печатный станок, который всегда служил палочкой-выручалочкой, тем более в предвыборной ситуации.

Вспомните, все эти нехитрые действия обкатывались властями в позапрошлом году. Тогда были выборы президента, сейчас - выборы в парламент. Печатный станок, собственно, уже набирает обороты. Объем рублевой денежной массы на 1.06.2012 г. достиг невиданных ранее 52,4 трлн рублей, в том числе объем наличных денег составил 8,3 триллиона.

Денежная масса растет не в пример ВВП. Заявления властей о том, что рост зарплаты должен быть обеспечен соответствующим ростом производительности труда, никто серьезно не воспринимает. На прежней материально-технической базе нашей экономики этого не достичь. К примеру, объем инвестиций в основной капитал в Беларуси, по данным Белстата, в январе - мае снизился на 21% по сравнению с аналогичным периодом прошлого года. Затраты на приобретение машин и оборудования - на 28,5%.

Масштабных прямых иностранных инвестиций как не было, так и нет. В решении поставленных задач белорусские власти по-прежнему уповают на российские преференции. И еще, наверное, на фарт. По их оценке, льготные цены на российские нефть и газ сохранят нам за год 5,2 - 5,4 млрд долларов.

Рассчитывают, что не один миллиард долларов нам может дать белорусское ноу-хау - выпуск растворителей-разбавителей, который с Нового года странным образом возрос в разы. В отличие от других нефтепродуктов эти товарные позиции не облагаются пошлиной, которая должна поступать в российский бюджет. Однако российские специалисты уже начали заниматься этой, мягко говоря, белорусской аферой.

Рост рублевой массы подпитывает инфляцию. Цены на продовольствие в мае текущего года по отношению к декабрю прошлого выросли на 9,7%. В мае по сравнению с апрелем цены на говядину бескостную

(Начало. Оконч. на стр.5)



ЗАЯВА

КААРДЫНАЦЫЙНАЙ РАДЫ МАГІЛЁЎСКАЙ АБЛАСНОЙ КААЛІЦЫІ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ

(Заканч. Пачатак на стар. 3)

У Рэспубліцы Беларусь не створаны ўмовы для правядзення свабодных выбараў, таму маючыя адбыцца выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу, не могуць лічыцца дэмакратычнымі, празрыстымі і справядлівымі.


Мы патрабуем правядзення ў Рэспубліцы Беларусь свабодных выбараў усіх узроўняў і абвяшчаем аб пачатку супольнай кампаніі па непрызнанню “парламенцкіх выбараў” 2012 года.

Мы заклікаем усіх грамадзян нашай краіны і ўсіх жыхароў Магілёўскай вобласці, якія маюць права прыняць удзел у выбарах, не ўдзельнічаць у галасаванні і далучацца да дзейнасці дэмакратычных сіл Магілёўшчыны.

Толькі сумесна мы зможам зрабіць нашу краіну сапраўды свабоднай і незалежнай!

Каардынацыйная Рада Магілёўскай абласной кааліцыі Дэмакратычных сіл

ПЕЧАТНЫЙ СТАНОК НАБИРАЕТ ОБОРОТЫ



увеличились на 7,8%, на хлеб и хлебобулочные изделия - на 7%, масло животное - на 6,3%, колбасные изделия и копчености - на 4,8%. В то же время на складах предприятий скопилось 243% среднемесячного объема произведенной продукции.

Только за апрель складские запасы увеличились на 700 млрд рублей, достигнув в итоге 20,3 трлн рублей. В общем, все, как всегда, все, как и ранее: очередное повышение зарплаты - очередное повышение цен. За исключением важной особенности. Если принимать во внимание ситуацию прошлого года, то до последнего времени валютные курсы белорусского рубля были относительно стабильны. Но, начиная с конца мая, начался устойчивый рост курса доллара.

Характерная сводка с биржевых торгов: 26 июня белорусский рубль сдал свои позиции по отношению к основным иностранным валютам, курс на которые устанавливался днем ранее. Курс доллара увеличился на 70 рублей, до 8360 рублей. Заявки на продажу составили 48,7 млн долларов, на покупку — 59,1 миллиона. Евро увеличился на 120 рублей, до 10.470 белорусских. Заявки на продажу были 36,7 млн евро, на покупку — 47,8 миллиона. Чистая продажа валюты на наличном и безналичном рынках сменилась чистой покупкой. Вкладчики все больше отдают предпочтение валютным вкладам. Их доля — свыше 68% всех банковских сбережений. Вновь последовало очередное напоминание российского посла о переходе на единую валюту (читай, российский рубль) как о единственном средстве спасения белорусской экономики (читай, через поглощение ее российской).

Не следует недооценивать еще один важный и тревожный симптом - устойчивое снижение мировых цен на нефть. Напомним, что в канун мирового финансово-экономического кризиса в 2008 году цены на нефть за полгода упали со 145 долларов до 35 долларов за баррель. И в настоящее время отмечается отрицательная динамика нефтяных котировок: цены на все ее виды сползли ниже 100 долларов, до 90-80 "зеленых". Равно как в таких случаях по известной закономерности набирает силу доллар.

Критическая цена нефти для российского бюджета, как определяют ее сами россияне, как раз 80 долларов. За ней в российской экономике, всецело зависящей от объема продаж энергоресурсов, начнутся сложности.

Следовательно, российский энергетический грант Беларуси может сойти на нет. По сообщениям СМИ, курс на снижение цен на нефть взял первый ее мировой добытчик Саудовская Аравия. Саудовцы увеличили добычу нефти. Якобы в их планах сбить цену на нефть до 60 долларов за баррель, чтобы подорвать экономику Ирана и его союзников. Если это так, то не поздоровится и экономикам России и Беларуси. Валютные реки могут легко превратиться в ручейки. О грядущей второй волне мирового финансового кризиса неоднократно предупреждал бывший министр финансов России А.Кудрин.

Впереди у Беларуси не только выборы в парламент, но и пик платежей по внешним долгам, который приходится на 2013-2014 годы. Министр финансов считает, что нам не уйти от новых заимствований на европейском рынке ценных бумаг, придется рефинансировать и старые долги. Не исключено, что при снижении валютных поступлений, если не пофартит с торговым балансом, возникнет необходимость распечатывать и валютные резервы страны.

Анализируя экономическую политику властей, невольно задумываешься над тем, чем же она отличается от предвыборной экономической политики 2010 года. И видишь все меньше различий и все больше сходства. Нет серьезных подвижек в реформировании экономики, модернизации ее технической и технологической базы. Она может выживать только при дешевых российских энергоносителях. Отсутствует диверсификация экспорта. Он по-прежнему зависим от мировых цен на нефть. Нам представляется, что это видят правительство и Нацбанк, которые должны извлечь уроки как из прошлогоднего валютного кризиса, так и из мирового финансового кризиса, который не минул нас в 2009 году и просто перешел в вяло текущую стадию. Если они этого не сделают, виноват будет тот, кто за все расплачивается, - белорусский народ…

доктор экономических наук
Борис Желиба, "Народная воля"

У Бялыніцкім раёне пенсіянер утапіўся ў калодзежы

Мясцовыя жыхары схіляюцца да версіі, што мужчына спрабаваў дастаць помпу "Ручеёк", якая зламалася, аднак вяроўка абарвалася і ён зваліўся ў ваду.

Здарэнне адбылося 25 чэрвеня ў вёсцы Галоўчын. Прыбыўшыя на месца здарэння выратавальнікі з дапамогай вяроўкі дасталі цела 60-гадовага мужчыны з дна 12-метровага калодзежа.

Медыкам хуткай дапамогі нічога не засталося як толькі канстатаваць смерць мужчыны.

БЫХОВСКОЕ ЭКОНОМИЧЕСКОЕ ЧУДО



Сергей Антонов

Говорится и пишется о Быховском замке много. Это, мол, и памятник архитектуры семнадцатого века, и национальная гордость и прочее, и прочее. Если же отбросить словесно-печатную шелуху, то наиболее точно о замке сказано в райисполкомовском видеоролике-презентации Быхова. Всего два слова. Зато какие точные и емкие – сохранился частично. Людям непосвященным, на ум сразу придут картины средневековых боев: катапульты, штурмовые башни и льющийся на головы штурмующих расплавленный свинец.

На самом деле наибольшим разрушениям Быховский замок подвергся в эпоху стабильности и процветания Беларуси. Разрушили его не полчища косматых варваров, не иноземные оккупанты, а наши с вами современники. Как тут не вспомнить бессмертную ильфопетровскую фразу «При всех властях стоял дом, а при советской сгорел».

К слову сказать, при советской власти у замка какой-никакой хозяин у замка был – мебельный цех местного завода металлоизделий. Потом арендаторы пошли помельче, а после отъезда последнего с фасада замка была снята табличка, в которой упоминалось о том, что памятник архитектуры семнадцатого века охраняется государством. Охранять стало нечего – сгоревшая крыша замка обрушилась, несущие стены оголились и разрушения стали необратимыми.

В Быхове не любят вспоминать о том, с какой помпой замок передавался в «сверхнадежные» руки последнего арендатора. А вспомнить есть что. В «раскручивании» предпринимателя со звучной фамилией Сапега и сомнительным послужным списком принимали участие не только местные власти, но и газета «Советская Белоруссия». Это печатный орган разместил хвалебную статью о новом владельце Быховского замка. Чего только в ней не было! И намеки на то, что предприниматель чуть не прямой потомок Льва Сапеги, и его «забота» о местных бомжах, которых наконец-то удалось пристроить на распиловке досок под крылышком нового хозяина, и обещание заделать дыру в крыше.

Заделать дыру не удалось, поскольку крыши не стало, как таковой. Бомжи разбежались в разные стороны, а предприниматель укатил в неизвестном направлении.

Виновных в сожжении памятника архитектуры не нашлось - пожарная служба трактовала пожар, как несчастный случай. «Советская Белоруссия» сменила хвалебный тон на траурный и в очередной статье посокрушалась о горькой участи Быховского замка.

Точка. Никто так и не был наказан. И это при всем том, что чиновники, участвовавшие в передаче замка бизнесмену до сих пор занимают руководящие посты, а депутаты местного Совета, несомненно санкционировавшие преступное решение своими подписями, в очередной раз при своих мандатах.

Дальше - больше. Неподалеку от развалин замка был выстроен особняк, который выглядит как дворец средневекового феодала. Назначение и принадлежность этого здания – тайна за семью печатями. Ходят слухи о том, что это – некая лодочная станция или служебная резиденция председателя Быховского райисполкома.

Удивительно, но воздвижение особняка пришлось на самый разгар экономического кризиса, когда государственные мужи во весь голос призывали народ жить по средствам. Откуда же нашлись средства на строительство особняка для главы района, который, надо сказать, никакими особыми достижениями не выделяется?

Да, скошена трава. Да, построены деревянные заборы, закрывающие вид на помойки. Да, ежегодно вылизывается улица перед зданием исполкома, но в остальном-то принципиальных сдвигов нет.

Быховские чиновники, напрямую причастные у уничтожению памятника национальной архитектуры, по-прежнему руководят убыточными предприятиями, строят шикарные резиденции и с умными лицами разъезжают на автомобилях, которым позавидовали бы американские сенаторы.

Нищета, потемкинские деревни и непомерные траты. Не в этом ли и состоит пресловутое белорусское экономическое чудо?

Размышления на эту тему, хочется закончить словами быховского поэта-передвижника, довольно точно описавшего ситуацию с двумя замками в своей «Балладе»:

Здесь были Меньшиков с Петром
И прочие вельможи.
Стоят два замка над Днепром,
Как близнецы похожи.

(Начало. Оконч. на стр. 7)

БЫХОВСКОЕ ЭКОНОМИЧЕСКОЕ ЧУДО

(Окончание. Нач. на стр. 6)

Один из замков – старожил.
Он - прошлого наследие.
Его Хадкевич заложил
В былинные столетия.

Другой, без лишней болтовни
Про дефицит бюджета,
Построен, братцы, в наши дни
Под нужды комитета.

А как же кризис? Вот дела!
Да это просто чудо!
Откуда «бабки» власть взяла?
Средства взяла откуда?

Нет-нет! Бюджет не оскудел.
Благодаря декретам
Нас кризис просто не задел
Так пишется в газетах.

Народ для лидеров-отцов,
Без лишних предисловий,
Готов воздвигнуть сто дворцов
Готов создать условия.

Чтоб в теннис поиграть могли,
Чтоб вовремя посеяли,
Для них хоромы возвели
И сауны с бассейнами.

В бюджете ж лишних денег нет
Все знают наизусть.
Ждал старый замок триста лет,
Еще потерпит пусть

Мораль баллады такова
Когда дела хреновы
И замков на горе аж два
Лелеять надо за новый!

Сергей Антонов



СПРАВКА "МАГІЛЁЎСКАГА ВЫБАРА"

Сергей Валентинович Антонов родился 26 августа 1968 года в Быхове.

В 1985 году закончил школу и поступил Могилевский технологический институт (ныне Могилёвский государственный университет продовольствия). Срочную службу (1987-89 гг.) проходил в Москве.

В 1992 году закончил институт по специальности инженер-механик.

Работал в районной газете «Маяк Приднепровья».

С 2000 года — собственный корреспондент минской газеты «Частный детектив».

Член партии Белорусский Народный Фронт с пятнадцатилетним стажем.

Библиография:

Три романа «Оргор» в жанре фэнтези. Мистические триллеры «Полнолуние» и «Скальпель доктора Менгеле» Издательство «Амадеус». 2008 год.

Романы «Темные туннели», «В интересах революции» и «Непогребенные»; рассказ «Tabula Rasa» для сборника «Вселенная Метро 2033. Последнее убежище», рассказ "Пушистик" для сборника "S.W.A.L.K.E.R Похитители артефактов" Издательство АСТ. 2010 — 2012 гг.

Роман-фэнтези «Пятиборец». Издательство «Эксмо». 2012 год.

Роман Сергея Антонова "Темные туннели» переведен на немецкий язык.

НА БУДОЎЛЯХ ДА "ДАЖЫНАК" - ХАЛАТНАСЦЬ І БЕЗАДКАЗНАСЦЬ

За апошнія месяцы на будоўлях, якія вядуцца да "Дажынак" у Горках, адбылося сем няшчасных выпадкаў, двое з якіх - цяжкія. Начальнік Горацкай міжраённай інспекцыі аховы працы Уладзімір Дзюрыч лічыць, што прыйшоў час біць ва ўсе званы, паведамляе раённая газета "Горацкі веснік".

Па словах Уладзіміра Дзюрыча, на будоўлях квітнее халатнасць і безадказнасць. Няма таго аб'екта, дзе б не было парушэнняў правілаў бяспекі. Паўсюдна людзі працуюць без спецвопраткі, ахоўных касак, страхавачных пасаў, бетоншчыкі з піламі - без акуляраў і ботаў. "Але самае дзіўнае — шасцімятровай вышыні лясы стаяць, выбачайце, на слове гонару: дзвюх цаглінах і без якога-небудзь мацавання да сценаў. Калі працоўныя па іх ходзяць, яны разгойдваюцца нібы арэлі. І гэта на вачах і з дазволу начальнікаў, якія нясуць за іх персанальную адказнасць", - кажа Уладзімір Дзюрыч.

Улады Магілёўскай вобласці рызыкуюць жыццямі людзей дзеля "паказухі" – каб дагадзіць высокаму кіраўніцтву, своечасова падрыхтаваўшы "Дажынкі". Будаўнікі з арганізацый розных раёнаў Магілёўскай вобласці, занятыя на гэтых працах, распавядаюць, што на іх абурэнні з прычыны незабеспячэння неабходных нормаў бяспекі падчас будаўнічых работ, кіраўнікі не звяртаюць ніякай увагі.

"На ўсе заўвагі заўсёды чуеш адзін адказ – " не падабаецца – звальняйся". А сям'ю ж карміць трэба, у Расію я ўжо наездзіўся. Таму вымушаныя маўчаць", - кажа адзін з будаўнікоў.

Віктар Баравікоў

Анекдот дня

– Вы спрашиваете, как называется книга, которая изменила мою жизнь?

Уголовный кодекс!

КАПРЕМОНТ И ТЕХОБСЛУЖИВАНИЕ ПО-ДЕРЕВЕНСКИ

В вымирающей деревне Селище Климовичского района доживает свой век дед Кузьменков. За долгую трудовую жизнь Николай Иванович немало поработал, в том числе и на северных просторах Советского Союза. Много где побывал, много чего повидал, но, в конце концов, вернулся в почти безлюдную сегодня родную деревню. Здесь в родимых местах пришла пора подводить жизненные итоги, получать заработанную нелёгким трудом пенсию. Всё бы хорошо, но недавний случай огорошил сельского пенсионера.



7 мая в хату Николая Кузьменкова принесли официальное письмо. Краткий текст гласил: «Предупреждение квартиросъёмщику. Кузьменков Николай, проживающему по адресу: Селище, улица Северная, корпус №А, дом №34. ДУКП «Жилком» предупреждает Вас, что на 27 апреля 2012 года за Вами числится задолженность за техническое обслуживание и капитальный ремонт в сумме 71758.88 (Семьдесят одна тысяча семьсот пятьдесят девять рублей). В связи с чем предлагаем в срок до 10.05.2012 в добровольном порядке погасить указанную сумму задолженности, в противном случае в соответствии с требованиями Жилищного Кодекса РБ, оказание коммунальных услуг до полного погашения задолженности будет приостановлено. Возобновление услуг будет производиться за счёт Нанимателя. Документы будут направлены в суд с обязательной оплатой пени и госпошлины».

Подписано предупреждение юрисконсультом ДУКП «Жилком» с неразборчивой подписью. Но вопросы возникают не только к фамилии, но и практически ко всему тексту. Для начала поясним, что раньше дом находился на балансе местного колхоза, а несколько месяцев назад он перешёл в ведение «Жилкома», от которого и было получено письмо. Так вот, даже в указанном адресе самого обычного деревенского дома почему-то называется непонятный корпус №А. Также нельзя не удивиться тому, что у Николая Ивановича образовалась задолженность перед «Жилкомом» за техническое обслуживание и капитальный ремонт. Хочется узнать, каким таким образом его обслуживали все эти месяцы, пока нарастала задолженность? Ну а слова про капитальный ремонт воспринимаются вообще как неудачная шутка. Это только в Беларуси граждане ещё платят государству за мифический капремонт, а в цивилизованных странах такая практика давно исчезла.

Пенсионера Кузьменкова предупреждают по-хорошему, что ему могут приостановить оказание коммунальных услуг. В случае же недопонимания серьёзности этого предупреждения Николаю Ивановичу следует готовиться к суду, с последующей «обязательной оплатой пени и госпошлины». Здесь опять возникают каверзные вопросы. Какие коммунальные услуги предоставляются сейчас Кузьменкову Николаю Ивановичу и как они могут быть приостановлены? За электричество он платит исправно, воду носит ведром, небезызвестные удобства находятся на улице. Может, ему собираются перекрыть тропинку к дощатому туалету во дворе?

Шутки шутками, но суть происходящего очевидна. Государство мало волнует, что одинокий пожилой пенсионер доживает свою старость в заброшенной деревне, в доме, который и нормальным жилищем трудно назвать. Но государство озабочено тем, как правильно и по закону, даже через суд, взять у старика несчастные семьдесят одну тысячу семьсот пятьдесят девять рублей. В результате оно побогатеет на сумму, эквивалентную стоимости трёх бутылок дешёвой водки. Если так и случится, то пусть выпьют за здоровье Николая Ивановича…

Сергей Аржанцев

магілёўскі **Выбар**

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі

Адрас рэдакцыі: Магілёўская воб, аг-к В. Машчаніца, вул. Савецкая, д.4. Тэл. 8 - 0259 204 308, e-mail: Boris152@gmail.com. Выдавец Міхайлаў Іван Барысавіч. Наклад: 299 асобнікаў, фармат А-4. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 03.07.2012 г. у 19-00.